

# Урок 96

Разгледзь два спосабы разважанняў пры дзяленні з астачай.

571 : 80 = ?

## Спосаб 1



1. Даведаюся, колькі разоў па 8 дзясяткаў змяшчаецца ў 57 дзясятках — 7 разоў.
2. Знаходжу астачу. Для гэтага 80 множу на 7, атрымліваю 560. Аднімаю ад 571 лік 560, атрымліваю 11.
3. Параўноўваю астачу з дзельнікам: 11 < 80.
4. Чытаю адказ — 7 (аст. 11).

## Спосаб 2



1. Знаходжу самы вялікі лік, які меншы за лік 571 і дзеліцца на 80 без астачы — гэта лік 560.
2. Дзялю 560 на 80, атрымліваю 7.
3. Знаходжу астачу. Аднімаю ад 571 лік 560, атрымліваю 11.
4. Параўноўваю астачу з дзельнікам: 11 < 80.
5. Чытаю адказ — 7 (аст. 11).

561 : 80 = 7 (аст. 11)

**1.** Выканай і правер дзяленне з астачай.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 486 : 60 | 248 : 30 | 631 : 90 | 362 : 40 |
| 735 : 90 | 143 : 40 | 327 : 50 | 676 : 80 |

**2.** Вылічы.

3 · 4020 – 5614 : 7 + 8507

(67 899 – 25 185 : 5) · (240 : 60)

**3.** Знайдзі значэнні выразаў.

- 870 000 : $a$, калі $a$ роўна 3; 30; 300.
- 490 · $c$, калі $c$ роўна 6; 60; 600.



Правообладатель Национальный институт образования

**4.** У латок змяшчаецца 10 яек. У латкі расфасавалі 125 яек. Колькі поўных латкоў атрымалася і колькі яек засталося?

**5.** Трэба пасадзіць расаду аксамітак на клумбы, па 20 кустоў на кожную. Прывезлі 326 кустоў расады. Колькі клумб можна засадзіць і колькі кустоў расады аксамітак застанецца?

**6.** Складзі задачу, якая рашаецца так:

$$120 \cdot 4 - 110 \cdot 4$$

**7.** Цяпер 20 г 20 мін. На колькі гадзін і мінут астатняя частка сутак меншая за тую, якая прайшла?

**8.** Экскурсавод расказаў турыстам, што Чырвоны касцёл у Мінску пачалі будаваць у 1905 г., а закончылі — у 1910 г. Колькі гадоў будавалі касцёл? У якім стагоддзі яго будавалі?



**?** Таня падзяліла некаторы лік на 30 і атрымала ў астачы 32. Ці правільна Таня выканала дзяленне з астачай?

**1.** Выканай і правер дзяленне з астачай.
253 : 50   494 : 70   578 : 60   354 : 40

**2.** У дзвюх цяпліцах агульнай плошчай 40 м$^2$ сабралі ўраджай перцаў. У першай цяпліцы сабралі 110 кг перцаў, а ў другой — 90 кг. Якая плошча кожнай цяпліцы, калі маса ўраджаю з квадратнага метра была аднолькавая?



Правообладатель Национальный институт образования